***А. У. Лаўрыновіч***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

**МЕЛАДРАМАТЫЧНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ Ў П'ЕСАХ АЛЕСЯ ДУДАРАВА**

У творчасці А. Дударава жанравыя прыкметы меладрамы заўважныя ў п'есах «Кім» (2001) і «Люці» (2002). Нагадаем, што меладрама – п'еса з завостранай інтрыгай, павышанай пачуццёвасцю і рэзкім проціпастаўленнем дабра і зла. Ёй характэрна рухомасць, патэтыка, перабольшаны паказ жарсцяў, адкрытая маральна-павучальная скіраванасць, наяўнасць у сюжэце нейкай таямніцы, якая вызначае ўвесь ход падзей.

У п'есе «Кім» пратаганіст падлетак Кім, шукаючы сродкі, каб вылечыць ад цяжкай хваробы сваю сястру Юлю, кідаецца ў авантуры, якія прыводзяць да самых неверагодных метамарфозаў і супадзенняў. У фінале расчулены глядач атрымлівае чаканы «хэпі-энд». У меладраме звычайна дзейнічае «квартэт» персанажаў. Першы герой – юны (юная), адрозніваецца дабрадзейнасцю, сумленнасцю, дабрынёй. Гэта персанаж-пакутнік, яго пераследуюць наканаваныя няшчасці. У п'есе «Кім» такая гераіня – Юля. Другая «маска» – тыран і нягоднік, у якім персаніфікуецца злы пачатак. Такі герой у «Кіме» – Каралёў. Трэцяя і чацвёртая маскі – абаронцы героя, які незаслужана пакутуе (Кім і Лена). Яны завяршаюць сістэму асноўных меладраматычных персанажаў. Падзел некаторых з'яў па прынцыпе «дабро – зло» ў п'есе вельмі яўны. Інтрыга ў творы трымаецца да апошняга – ці сапраўды Каралёў – бацька Кіма і ці акрыяе Юля ад хваробы? У мове персанажаў праглядваецца патэтыка, залішняя драматызацыя і пачуццёвасць: «Як хочаш... Якая я шчаслівая... Палову свайго жыцця не жыла, а ляцела... Што б ні здарылася, што б ні накацілa... варта было толькі ўспомніць пра цябе – усё! Усе праблемы радасцю рабіліся... *(Смяецца.)* Калі ў час путчу цябе арыштавалі, я хацела на плошчы абліць сябе бензінам і падпаліць» [1]. Або: «Я і без аналізу ведаю: кроў мая сапсаваная ўшчэнт...» [1].

Да жанру «меладраматычны дэтэктыў» належыць п'еса «Люці», у якой інтрыга зноў прысутнічае да самай развязкі. Гэтая п'еса распавядае пра жанчыну, якая ў маладосці працавала на тэлебачанні. У навагоднюю ноч пад дзверы яе кватэры прыходзіць таямнічы мужчына, які прадстаўляецца Капітанам і праводзіць з ёй ноч. Пасля гэтага ў жыцці Люці пачынаюць адбывацца нейкія дзівацтвы, якія яна спрабуе разблытаць, наладжваючы паўнавартаснае дэтэктыўнае расследаванне. П'есе ўласціва павышаная эмацыянальнасць і «хэпі-энд»: «Тише-тише-тише-тише... (Подходит к тахте, садится на пол.) Спи... Сегодня Воскресение Господне... Слышишь колокола?.. (К а п и т а н стонет.) Спи... Спи-и... Завтра пойдем к отцу Петру... и он... обвенчает нас... И ты уже никогда не сможешь покинуть меня ни в горе, ни в радости... Ни в радости, ни в горе... Господи, как же я люблю тебя... Как же я тебя люблю...» [2].

Такім чынам, у творчасці А. Дударава выразныя прыкметы меладрамы выяўлены ў п'есах «Кім» і «Люці». У абодвух творах перабольшана трагічнае спалучаецца з сентыментальным, чуллівым, прысутнічае вострая інтрыга, гіпербалізаваная пачуццёвасць, заўважаецца рэзкае супрацьпастаўленне дабра і зла, «хэпі-энд».

**Літаратура**

1 Дудараў, А. Кім [Электронны рэсурс] / А. Дудараў. – Рэжым доступу : https://knihi.com/Alaksiej_Dudarau/KIM.html. – Дата доступу : 08.04.2021.

2 Дударев, А. Люти [Электронный ресурс] / А. Дударев. – Режим доступа : https://www.dudarev.of.by/pesy. – Дата доступа : 09.04.2021.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ